# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

17 студзеня 2020 г. № 2 (538)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## Усе заканадаўчыя змены дыктуе жыццё

### Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала ААТ «Кандытарская фабрыка «Слодыч»

**СПІКЕР верхняй палаты парламента пазнаёмілася з асноўнымі паказчыкамі прадпрыемства, яго вытворчасцю, сустрэлася з працоўным калектывам і адказала на ўзніклыя пытанні. Такая актыўная форма работы ў межах адзіных інфармацыйных дзён дае свой плён. І вось чаму.**

### Лідар рынку

Старшыня Савета Рэспублікі з'яўляецца ўпаўнаважанай па Мінску, таму яе ўвага да работы сталічных прадпрыемстваў зразумелая. Тым больш што на гэтую кандытарскую фабрыку яна трапіла ўпершыню. Нагадаем, што тут выпрабляюць печыва на ўсе ўзросты і любы густ. Зараз «Слодыч» лічыцца лідарам беларускага рынку печыва і кандытарскіх вырабаў з мукі: тут пякуць больш за 100 відаў печыва, а прадукцыя фабрыкі займае 24 % айчыннага рынку гэтай прадукцыі. Ёсць і экспарт, які за тры леташнія кварталы склаў 1,5 мільёна долараў, паведаміў **намеснік дырэктара па камерцыйнай дзейнасці Сяргей ТРЫБОЙ.** Дзе ўпадабалі беларускае печыва? У 18 краінах свету (большай часткай у Расіі), сярод спажыўцоў ёсць нават В'етнам і ЗША.

Працуюць на прадпрыемстве галоўным чынам жанчыны — іх з больш чым 500 чалавек працоўнага калектыву прадпрыемства 68 %. Што і не дзіўна: смачная выпечка — справа пяшчотных жаночых рук.

стар. 2

ТЭМА ТЫДНЯ

## РЭЗЕРВЫ «МЯСЦОВАЙ СКАРБОНКІ»

### Карэспандэнт «МС» высвятляла на прыкладзе Чавускага раёна, як тут зарабляюць на сваё развіццё

**Ад Магілёва да Чавус гадзіна язды на аўтобусе, на асабістым транспарце можна «даляцець» і хутчэй. Утульны гарадок з дастаткова добра развітай інфраструктурай, ёсць рака, чыгунка — што яшчэ трэба для стабільнага жыцця? Але без датацый справа ўсё роўна не абыходзіцца. Няма буйных вытворчасцяў, а значыць, і актыўных паступленняў у бюджэт. Ці лёгка сёння напаўняць «мясцовую скарбонку» і як развівацца, калі грошай не хапае, — на гэтую тэму паразважаў старшыня Чавускага райсавета, кіраўнік Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН.**



Фота дадзена Чавускім райсаветам.

Прэзідэнтам краіны пастаўлена задача да 2025 года павялічыць ВУП да 100 мільярдаў долараў. І без павелічэння выручкі на аднаго работніка, пошуку новых відаў прадукцыі, адкрыцця новых вытворчасцяў тут не абысціся. Для гэтага трэба актыўна працаваць, уцягваць у абарот нявыкарыстаную маёмасць, шукаць спосабы прыцягнуць грошы ў бюджэт. У Чавускім раёне робяць стаўку на развіццё сельскай і лясной гаспадаркі.

— У нас ёсць прыдатныя пляцоўкі, але пакуль, на жаль, няма праектаў, якія б сур'ёзна паўплывалі на становішча. Ёсць патэнцыйныя інвестары, але яны яшчэ прыглядаюцца, вывучаюць попыт. Напрыклад, ТАА «Саўэкспарт» наладжвае ў раёне вытворчасць гофракардону, — удакладняе Анатоль Мацюлін.

Сёння вітаюцца альтэрнатыўныя спосабы прыцягнення грошай у бюджэт. І ў гэтым вялікія надзеі ўскладаюцца на актыўную частку мясцовага насельніцтва.

стар. 14

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Патрэбная дапамога



Сенатары бяруць шэфства над РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. стар. 3

### Не побач, а разам



Пра што ішла гаворка на сустрэчы парламентарыяў са старшынёй Мінаблвыканкама. стар. 4

### Жыць па сродках



Пра некаторыя асаблівасці рэспубліканскага бюджэту, накіраваныя на забеспячэнне збалансаванасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. стар. 13

### «Бамбілы» наступаюць



Нядобрасумленная канкурэнцыя ў пасажырскіх перавозках вядзе да страт і банкруцтва... стар. 4

### Гаспадарскі падыход



Як на Брэстчыне жыве сельсавет памерам у адну вёску? стар. 15